# ЯК ГЭТА БЫЛО

У Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці знаходзяцца на захаванні тысячы дакументаў перыяду часовай нямецка-фашысцкай акупацыі. З першых дзён уварвання на нашу тэрыторыю немцы пачалі ўстанаўліваць свае парадкі. Усюды была ўведзена нямецкая сістэма адміністрацыі. Тэрыторыя дзялілася на ўезды, уезды на воласці. Больш шасцісот спраў з'явілася ў выніку дзейнасці ўстаноў Гродзенскага ўезднага камісара.

Дзейнасць уезднага камісара зводзілася да анямечвання і каланізацыі ўезда. Лепшыя землі рэгістраваліся для немцаў. Сялянства аблагалася вялікім падаткам і зборам у натуры для нямецкай дзяржавы. За невыкананне распараджэння сяляне караліся канцлагерам і смерцю. Таксама з першых дзён вайны, 6 жніўня 1941 года, былі створаны біржы працы, г.зн. бюро па набору рабочай сілы. Мужчыны ва ўзросце 20-21 года і жанчыны з 18-19 год падлягалі прымусовай рабочай павіннасці ў Германіі. Асобы, якія ўхіляліся ад адпраўкі, адшукваліся паліцыяй і жандармерыяй, а іх сем'і падвяргаліся рэпрэсіям. Так, з Бераставіцкага раёна было адпраўлена ў Германію на працу больш за 700 чалавек.

З дакументаў фонда «Надзвычайнай камісіі па выяўленню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ўліку прычыненых імі страт па Гродзенскай вобласці за 1941-1944г.г.» па Бераставіцкаму раёну загінула на франтах – 696 чалавек, у партызанах і падполлі – 18 чалавек. Спалена 10 чалавек, расстраляна 271 чалавек, закатавана 27 чалавек.

М.Караськ, загадчык аддзела Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці.